БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 17 (99)
май
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Небяспечныя гульні

с.4

Улада с.2
Свята с.3
Вера с.5
Праблема с.8

KALINKA.org

Чалавек сярод людзей

20 мая 2009 года адбылося чарговае паседжанне выканкама Брылеўскага сельскага Савета. Галоўнае пытанне павесткі дня - аб выкананні праграммы ўдасканалення сацыяльнай работы з адзінокімі і адзінока пражываючымі на тэрыторыі сельсавета грамадзянамі сталага ўзросту.

Старшыня выканкама Уладзімір Ільіч Мажораў у сваёй справаздачы адзначыў, что гэтае пытанне вельмі важнае і заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі дзяржавы. У нашым раёне распрацавана адпаведная праграма, закранаючая ўсе пытанні жыцця састарэлых грамадзян. Гэтай катэгорыі насельніцтва без дапамогі вельмі складана.

На тэрыторыя сельсавета пражывае 27 чалавек, якія адносяцца да гэтай групы. Кіраўніцтва сельсавета, СПК "Макаранцы" і УКАП "Фірма "Днепр" не пакідаюць гэтых людзей па-за ўвагай. З імі трымаецца сталая сувязь, і па меры неабходнасці ім аказваецца матэрыяльная і іншая дапамога. Ім прадаецца гародніца па зніжаных коштах, выпісваецца зерне, апрацоўваюцца зямельныя надзелы і г.д.

У.І.Мажораў

Калі існавала базавая школа, школьнікі аказвалі састарэлым дапамогу. Зараз з гэтым узніклі пэўныя цяжкасці з-за закрыцця гэтай навучальнай установы, але трэба прасіць кіраўніцтва Кадзінскай школы працягваць гэтую добрую традыцыю.

Работнікі аддзялення сувязі выконваюць заказы састарэлых, выплочваюць пенсіи ў адпаведныя тэрміны. Культработнікі ўдзельнічаюць ў працы *"Поезда "Забота"*. Медыцына імкнецца працаваць на высокім узроўні, але на Брылеўскім ФАПе ўзніклі пэўныя цяжкасці ў сувязі з адсутнасцю работніка. Значную дапамогу выканкаму аказваюць старшыні вясковых селькамаў. Трэба зрабіць усё, каб адзінокія людзі адчувалі ўвагу і атрымлівалі неабходную дапамогу.

Н.І.Рамашкевіч

А.М.Шляхтава

Намеснік генеральнага дырэктара УКАП "Фірма "Днепр" Алена Мікалаеўна Шляхтава паведаміла, што фірма будзе і надалей дапамагаць сталым людзям, большасць з каторых з'яўляюцца ветэранамі працы і ў свой час аддалі шмат сіл калгаснаму будаўніцтву.

Старшыня селькама в.Брылі Тамара Васільеўна Максімчыкава звярнула ўвагу на тое, што сярод насельніцтва памяншаецца пагалоўе ската. Ёсць пытанні па здачы малака і асямяненню кароў. Трэба таксама адзначыць недастатковую выхаваўчую работу сярод некаторых падлеткаў, якія часам зняважліва ставяцца да старых людзей.

А.М.Яцкова

В.В.Ляутка

Па абмеркаванаму пытанню была прынята адпаведнае рашэнне.

Сакратар выканкама сельсавета Надзея Іванаўна Рамашкевіч праінфармавала аб пытаннях мясцовага землеўпарадкавання, аб дазволах на будаўніцтва.

У.І.Мажораў дадаў, што з 1 мая 2009 г. дазваляецца прадастаўляць гараджанам пустуючыя ўчасткі для будаўніцтва жылля, чаго дагэтуль не было.

Дэпутат Наталля Анатольеўна Ярмаш паведаміла, што па пытанню рамонта мясцовай лазні прыязджала камісія райвыканкама і зрабіла заключэнне, што будынак знаходзіцца ў аварыйным стане.

В.В.Маскалёў

Н.А.Ярмаш

М.Я.

Сталічная справаздача

22 мая 2009 г. Магілёўская вобласць рабіла творчую справаздачу ў мінскім Палацы Рэспублікі. Перад Палацам на Кастрычніцкай плошчы былі разгарнуты падворкі ад кожнага з раёнаў Магілёўшчыны. Найбольш цікавым, па меркаваннях прысутных, быў падворак Магілёўскага раёна, аздоблены гістарычнымі персанажамі на чале з імператарам Пятром I.

Святочны канцэрт на самай вялікай сцэне краіны перагарнуў старонкі розных творчых фестываляў, якія праходзяць у Магілёўскай вобласці, і прадэманстраваў высокі ўзровень самадзейнага мастацтва прыдняпроўскага краю. Ад Магілёўскага раёна ў канцэрце ўдзельнічалі вядомыя калектывы -- ансамблі "Славіца" і "Звончыкі". Дэлегацыя Магілёўскага раёна на чале са старшынёй райвыканкама Д.Д.Гобаравым была прыемна ўражана размахам і мастацкай узнёсласцю гэтай творчай справаздачы, дзе пранікнёна спалучыліся аўтэнтычныя фальклорныя вытокі мінулага і імклівы рух дынамічнага і вельмі зменлівага сёняшняга дня.

Мікола ЯЦКОЎ.

Перад Палацам Рэспублікі разгарнуліся гістарычныя падзеі.

Фотаздымкі М.Яцкова.

Начальнік аддзела культуры Магілёўскага райвыканкама Аляксандр Леанідавіч Алекса, намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Валерый Казіміравіч Яленскі і дырэктар РЦКС аддзела культуры Вольга Міхайлаўна Багачова ўпэўнены: выступленне магілёўскіх артыстаў запомніцца жыхарам сталіцы надоўга.

Прадстаўнікі делегацыі Магілёўскага раёна: Раіса Мікалаеўна Буконкіна, Аляксандр Якаўлевіч Цароў, Аляксандр Віктаравіч Харытоненкаў, Валерый Іванавіч Разганаў.

Вітальнае слова старшыні Магілёўскага аблвыканкама П.М.Рудніка.

Святочны карагод.

ЭКСТРЭМАЛЬНАЯ ГУЛЬНЯ

Што непарушна кладзецца ў памяць кожнага з нас адтуль -- з пары сонечнага і бязвоблачнага дзяцінства?.. Спіс гэты не будзе вельмі доўгім. І асноўнае месца тут будуць займаць тыя гульні, якія кожны дзень клікалі нас на вуліцу.

Што застанецца ў памяці брылеўскіх дзяцей, асабліва тых, хто жыве ў нашым “аграгарадку” -- на вуліцы Юбілейнай? Думаю, шмат што. І ўменне, стукнуўшы па футбольнаму мячу, паспець скокнуць убок ад машын, якія імчацца прама на цябе -- бо футбольнае “поле” тое месціцца якраз пасярэдзіне вуліцы. І ў чарговы раз пачуць, як сыплецца ад удара шкло ў акне буфета -- хоць там і краты дабротныя. А калі рамонтнікі з грузавіка выгрузяць кучу пяску для работы, то трэба ж паспець там пакорпацца, будуючы толькі табе вядомыя, крэпасці і замкі... А што пра спартыўныя нейкія пляцоўкі, то тут гаворкі нават і няма. Аднойчы, гадоў дваццаць таму назад, калі ў калгасе старшынёй быў Аляксандр Віктаравіч Кузняцоў, была думка пабудаваць свой стадыён. Нават абсталяванне закупілі. Але праляжала яно пару гадоў нерухома, і ў канцы канцоў прадалі тыя баскетбольна-валейбольныя прылады некаму больш разваротліваму.

Спрабавалі неяк нашы падлеткі саматужна зрабіць футбольнае поле на лузе, але месца там забалочанае і меліярацыяй “да кандыцыі” не даведзетае. А як па балоту ў футбол ганяць?.. Яшчэ было поле ля школы, але нядаўна нехта “разумны” паламаў вароты *(гл. вокладку гэтага “Летапісу”)*. Вось і пайшлі нашы дзеці са сваімі мячыкамі на вуліцу -- гуляць у гульні, якія са звычайных ператварыліся ў экстрэмальныя. А гэта ўжо сур’ёзная справа...

Што застанецца ў памяці?..

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара *(май 2009 г.)*.

На праезджай частцы вуліцы Юбілейнай

“Пясочніца” ля дарогі

“Пясочніца” ля пад’езда

“Класікі” ля сталовай

Пытанні будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі абмяркоўваюць майстар брылеўскага ўчастка МУКП “Жылкамгас” Аляксандр Мікалаевіч Сілкоў, дырэктар УА “Брылеўская школа-сад”, дэпутат Наталля Анатольеўна Ярмаш і старшыня выканкама Брылеўскага сельсавета Уладзімір Ільіч Мажораў.

Иван БУНИН.

Троица.

Гудящий благовест
к молитве призывает,
На солнечных лучах
над нивами звенит;
Даль заливных лугов в лазури утопает,
И речка на лугах сверкает и горит.
А на селе с утра идёт обедня в храме:
Зелёною травой усыпан весь амвон,
Алтарь, сияющий и убранный цветами,
Янтарным блеском свеч и солнца озарён.
И звонко хор поёт, весёлый и нестройный,
И в окна ветерок приносит аромат...
Твой нынче день настал,
усталый, кроткий брат,
Весенний праздник твой,
и светлый и спокойный!
Ты нынче с трудовых засеянных полей
Принёс сюда в дары простые приношенья:
Гирлянды молодых берёзовых ветвей,
Печали тихий вздох, молитву – и смиренье.

СЕМЬЯ

Протоирей Андрей КУПЦОВ из Трёхсвятительского Кафедрального собора:

-- Чтобы была нормальная семья, должны быть нормальные семейные ценности. Но мы их, к сожалению, не наблюдаем.

Семья – это самопожертвование. Если человек построит дом на песке, ветры и наводнения разрушат его. А если на фундаменте – дом стоит. А фундамент – это нравственность человеческая, престиж семьи напрямую зависит от нравственности. Большая беда для общества, что женщина ушла из семьи – её вырвали, особенно в период пятилеток, строек. А добрая жена семью сохраняет. И дети возле неё.

...Буквально на днях мои дети играли во дворе. И вот одна девочка говорит: «Поднимите руки те, у кого дома есть морская свинка?» И сама поднимает. «А у кого попугайчик? А у кого хомячок?» А моя старшая дочь говорит: «А поднимите руки те, у кого есть младшая сестра?» И обе мои младшие дочки подняли руки. А остальные дети смутились... Хотелось бы, чтобы люди больше радовались тому, что у них дома есть младшие дети, сёстры и братья, а не хомячки. Пока мы будем воспитывать собак, дети будут пропадать.



МОЖНО ЛИ ВЫБРАСЫВАТЬ ОСВЯЩЁННОЕ В ЦЕРКВИ?

После Пасхи скопилось огромное количество освящённых яиц. Как их правильно утилизировать?

Как разъяснили в Отделе внешних церковных связей Московского патриархата, в принципе не стоит доводить до того, чтобы освящённые продукты портились. Используйте такие предметы, продукты питания во время и к месту. Всё то, что окропляется святой водой, не должно быть выброшено на помойку или в мусоропровод. Если уж возникла необходимость утилизации, сожгите всё, закопайте где-нибудь под деревом или выбросьте в проточный водоём.

(«Аргументы и факты», № 17, 2009 г.)

КАК ПРАВИЛЬНО И С КАКИМИ МОЛИТВАМИ ПРИКЛАДЫВАТЬСЯ К ЦЕРКОВНЫМ СВЯТЫНЯМ.

При прикладыванию к святому Евангелию, Кресту, честным мощам и иконам следует подходить в должном порядке, не спеша и не теснясь, перекрестившись, класть два поклона перед целованием и один после целования святыни.

Поклоны совершать по дню -- земные или глубокие поясные, касаясь рукой земли.

Прикладываясь к иконам Спасителя, Божией Матери и святых, НЕ СЛЕДУЕТ целовать их в лик.

В Патриаршем чиновнике середины XVII в. указывалось, что, прикладываясь к иконам Спасителя, следует целовать в ножку (при поясном изображении -- в ручку); к иконам Божией Матери и святых -- в руку; к иконе Нерукотворённого Образа Спасителя и к иконе Усекновения главы святого Иоанна Крестителя -- в косу власов.

На иконе может быть изображено несколько священных лиц, но при стечении молящихся целовать икону полагается один раз.

Перед образом Спасителя следует произносить про себя Иисусову молитву: «Господи Иисусе Христе, Сыне Божий, помилуй мя, грешнаго (ую)» или: «Без числа согреших, Господи, помилуй мя».

Перед иконой Пресвятой Богородицы нужно произносить следующую молитву: «Пресвятая Богородица, спаси нас».

Перед Честным Животворящим Крестом Христовым с последующим поклоном читают: «Кресту Твоему поклоняемся. Владыко, и святое Воскресение Твоё славим». *(«МВ»)*

Вялікі дзякуй!

Калі гляджу на вось гэты лісток календара, дзе мой бацька Адам Фролавіч напісаў усе гэтыя надпісы, то нават і не верыцца, што мінула з той пары пяцьдзесят гадоў. Але гэта так. Жыццё бяжыць, і ад гэтай дыялектыкі нікуды не дзецца. А калі ў дзень юбілея разам з табой сям’я і сябры, то трэба сказаць “дзякуй” лёсу за гэта.

Шчыра кажучы, не чакаў, што гэта дата атрымае такі рэзананс у Брылях і нашым раёне. Вельмі ўдзячны Уладзіміру Ільічу Мажораву, Надзее Мікалаеўне Васіленка, Ірыне Збышкаўне Дудар, Надзее Іванаўне Рамашкевіч і Людміле Андрэеўне Парфененка за цудоўны падарунак -- пейзажную карціну, і за добрыя словы, якія яны мне сказалі. Хочацца падзякваць старшыню Магілёўскага райвыканкама Дзмітрыя Дзмітрыевіча Гобарава і намесніка старшыні райвыканкама Валерыя Казіміравіча Яленскага, якія павіншавалі мяне ад імя райвыканкама і ўручылі вышэйшую ўзнагароду раёна -- Ганаровую грамату. Выказваю словы ўдзячнасці начальніку аддзела культуры райвыканкама Аляксандру Леанідавічу Алекса, які сказаў цёплыя словы і разам з Граматай аддзела культуры і прафкама перадаў мне медаль *“300 лет битвы при Лесной”*, якім мяне яшчэ ў мінулым годзе ўзнагародзіў маскоўскі камітэт ветэранаў за стварэнне песні пра гэту бітву. Як кажуць, узнагарода знайшла героя... Было таксама вельмі прыемна пачуць нават вершаваныя радкі ад сваіх таварышаў па творчаму цэху. Вось што напісала Раіса Мікалаеўна Буконкіна:

Яцкоў Мікола, сын Адама,
Пражыў ужо паўсотні год.
Сваёю творчасцю, натхненнем
Брылеўскі пакарыў народ.
Міколу ведае Радзіма,
Гардзіцца ім часной народ,
Жадае сёння юбіляру
Пражыць яшчэ і сотню год...

А мой сябра з Мінску вядомы паэт Кастусь Цыбульскі выказаўся так:

Час і грозны, і суровы,
Сэрца холадам пячэ,
Ды ад музыкі Яцкова
Ён цяплей, святлей, ярчэй.
Хай іграе твая ліра,
Хай спявае Магілёў!
Будзь прыгожы, дужы, шчыры
І твары да ста гадоў!

Мне было вельмі ўтульна сярод тых віншаванняў, якія мне выказалі і мае аднавяскоўцы-брылеўцы, і сябры па працы, і самыя дарагія мне людзі -- мая матуля Яўгенія Яўсееўна, мой брат Сяргей, мая жонка Ала, дзеці Юлія, Вольга, Аляксандр і Наталля, унук Антон і зяці Норман і Аляксей. Вялікі вам дзякуй, мае даражэнькія, за тое, што помніце, за вашыя добрыя словы і пажаданні!..

Хочацца сёння ўспомніць і майго нябеснага заступніка -- святога Мікалая Угодніка, які асвяціў сваёй прысутнасцю дзень майго нараджэння і вось ужо паўстагоддзя вядзе мяне скрозь жыццёвыя завірухі...

Дзякуй вам усім за тое, што вы ёсць!

Шчыра ваш

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

№ 5, 2009 г.

Вядомы беларускі пісьменнік Янка СІПАКОЎ аб рэальным выпадку з жыцця:

"Перад плошчаю Бангалор у Мінску нярэдка здараюцца заторы транспарту. Тады ў тралейбусе едзеш вельмі марудна -- ён спынецца праз кожныя пару мертаў. І ты хочаш ці не хочаш, глядзіш у акно.

Янка Сіпакоў

Па тратуары, побач з тралейбусам, ідзе маці з двума дзецьмі -- большанькай дзяўчынкай і меншанькім хлопчыкам. Дзеці, мусіць, вяртаюцца са школы -- за плячамі ў іх ранцы, плечакі.

Маці з дачкою ідуць упоплечкі, а хлопчык -- зводдаль. Маці не дазваляе яму наблізіцца да іх. Калі крыху наблізіцца, яна спыняецца, пагрозліва падыходзіць да малога і нешта, бачна па вуснах, грэбліва крычыць на яго, нешта забараняе. Хлопчык -- акуратненькі такі, але, вядома ж, у нечым вельмі правінаваціўся.

Хлопчык усё ж праз нейкі час зноў даганяе маці, забягае ёй наперад, нешта тлумачыць, просіць яе. Вочы ў яго поўныя слёз, а тая не слухае малога, адпіхвае ад сябе, круціць яму вушы і паказвае пальцам: прэч ад мяне назад!

Хлопчык нейкі час пляцецца за імі на адлегласці, а тады зноў забягае наперад. І, глытаючы слёзы, штосьці даказвае, прабачце, просіцца.

Але маці непахісная. Яна злосна, не шкадуючы, б'е сына па мокрых ад слёз шчочках: справа -- налева і злева -- направа! І зноў адпіхвае ад сябе, ды так, што малое падае на тратуар...

Маці, што ж гэта ты робіш, маці?! Ты што, не бачыш, маці, што зараз робіцца ў дзіцячай душы? Ты што, не разумееш, маці, як гэта балюча -- не, не целу, а якраз душы? Куды яму ісці, калі маці адпіхвае ад сябе? Да каго прысланіцца, калі маці так ненавідзіць? З кім перажыць тую сваю віну, якая здарылася, калі маці такая чужая яму? А якой бы мізэрнаю здалася тая, нават вялікая віна, калі б маці прыгарнула яго да сябе?

Маці, хутчэй азірніся, вярніся, паднімі сына, спытай, ці пабіў ён каленькі, прытулі да сябе, пашкадуй, пацалуй, даруй яму ўсё, што ён натварыў. І сын у другі раз не зробіць гэтага!

Маці, хутчэй вытры слёзы свайму дзіцяці, папрасі ў яго прабачэння, за тое, што здарылася!..

Але маці, абняўшы за плечы дачку, спакойна, не азіраючыся, пайшла, мусіць, дадому.

А куды ж ісці хлапчуку, калі маці, родная маці, гоніць яго ад сябе? Што яму рабіць, дзе шукаць паратунку?..

Малы падняўся, паправіў на плячах ранец з кнігамі і, разгублены, прыгнечаны, рыдаючы пайшоў сам сабою.

Я амаль фізічна адчуваў ягоны боль і яго скруху.

Што ж ты нарабіла, маці?! Запомні, маці: ён, сын твой, ніколі табе не даруе гэтага. Хоць вы, канечне ж, і памірыцеся з ім, аднак, мне здаецца, сын і сівым будзе памятаць, як ты адганяла яго ад сябе...

Тым часам затор раз'ехаўся, і застоены тралейбус, быццам нічога і не здарылася, весела спяшаючыся пабег паўз засмучанага хлопчыка".

№ 20, 2009 г.

Павел Лунгін

Вядомы расійскі кінарэжысёр Павел Лунгін скончыў працу над фільмам *"Царь"* і разважае над прыродай улады:

«...Иван Грозный первым показал, что власть в России должна быть грозной. Эта власть не верит тем, кем управляет. Ведь Грозный не верил никому, даже самому близкому окружению. Он считал, что все -- предатели. Все воры. А значит, и казнить в принципе можно любого. Таким же образом потом действовал Сталин, выдавая разнарядки на аресты и казни.

...У Грозного была идея -- идея о том, что Россия -- это Третий Рим, а он -- намесник Бога, а практически -- Бог на земле. Государство, которое он создавал, строилось на одном лишь бесконечном обожании его персоны. Об этом не любят говорить, но итоги его правления были очень печальны. Смутное время с поляком на русском троне -- это прямое следствие правления Грозного. Поэтому те, кто так хватается за его персону, не понимают, что подобные методы управления страной не спасение и не панацея.

...У народа должна быть какая-то объединительная идея. И люди должны объединяться не на ненависти к чужим, а на любви к стране и себе. И какое бы раздражение не вызывала Америка, но я нигде больше не видел людей, так искренне влюблённых в свою страну».

Жаркое воскресенье. На ферме все животные попрятались в тень. Тишина, густой горячий воздух неподвижен...

Вдруг из курятника со страшным криком вылетает петух:

-- Я ошибся, я ошибся!

За ним выползает взъерошенная утка и бормочет:

-- Ничего страшного, ничего страшного...

Прозвішча падпісчыка

Ламаць - не будаваць

Прыйшоўшы 3 мая 2009 года на працу, настаўнікі і работнікі Брылеўскай школы-сада былі непрыемна здзіўлены, убачыўшы, што значная частка агароджы вакол школы мае вось такі выгляд. І, як высветлілася, зрабілі гэты пагром не нейкія чужынцы, а нашы падлеткі -- гуляючы ў свае дзіўныя гульні і запамятаваўшы што такое ***школа...***

Праз некаторы час усе гэтыя дзіркі былі акуратна адрамантаваны, але пытанні засталіся. Напрыклад, такія: адкуль у нашых людзей з'яўляецца імкненне не будаваць, а разбураць? Чаму парадак на роднай зямлі павінен усталёўвацца указамі і загадамі "зверху"? Чаму ў нас няма патрэбы імкнуцца да прыгажосці, ствараць яе і жыць у прыгожым асяродку?.. Пісаў жа калісьці наш зямляк Фёдар Дастаеўскі: *"Прыгажосць уратуе свет".* А мы, здаецца, і не жадаем гэтага ўратавання...

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара.
(3.05.2009 г.).



Т.А.Алданава

Белы лебедзь у чароўным садзе

Але ж усё-ткі ёсць сярод нас людзі, для якіх прыгажосць -- аснова жыцця. Сярод іх і Таццяна Аляксееўна Алданава з вёскі Качурына. Кожны год на яе падворку з'яўляюцца зробленыя сваімі рукамі ці то бусел на даху, ці то белы лебедзь у зацішку пад яблынькай. А нядаўна ў зробленым дэкаратыўным палісадніку запалымнела пад сонцам чароўная кветка, створаная са звычайных пластыкавых бутэлек. Таццяна Аляксееўна упэўнена, што жыць трэба прыгожа і ў прыгажосці. І нельга не згадзіцца з гэтым.

М.Я.

"БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС"
Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў
Выдаецца з мая 2006 г.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адказны за выпуск -
Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
На правах рукапісу.
Пры перадруку матэрыялаў
спасылка на "Брылеўскі летапіс" абавязковая.
© "Брылеўскі летапіс", 2009
Звярстана і надрукавана
на прыватным абсталяванні.
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі,
вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com